УДК 882.26:808.26

В.М. Гусева, выкладчык

# ВЫКАРЫСТАННЕ ТВОРАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА ЗАНЯТКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

In the article wide sprectrum of fiction (cognitive, estetic and educational) gives the opportunity to examine it as the powerful means in the process of studying in High educational establishments.

На сучасным этапе перад вышэйшай школай стаіць задача выхавання не толькі высокакваліфікаваных спецыялістаў, але пры гэтым асоб, усебакова і гарманічна развітых. Навучанне і выхаванне сёння непарыўна звязаныя паміж сабой. Развіццё інтэлекту, уменняў разважаць і аналізаваць, удасканаленне творчых здольнасцяў, пашырэнне кругагляду студэнтаў – гэта галоўныя задачы педагогаў. Вялікую ролю ў гэтых працэсах адыгрывае літаратура.

Мастацкая літаратура мае шырокі спектр функцый. Назавём найбольш важныя.

**Пазнаваўчая функцыя**. Літаратура дае самыя разнастайныя веды па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі і г. д., прычым пазнанне з'яўляецца пачуццёвым. Інакш кажучы, літаратура ўздзейнічае як на розум, так і на пачуцці чалавека. Яна дае матэрыял для пазнання жыцця і фарміравання светапогляду чалавека.

**Камунікатыўная функцыя**. Мова мастацкай літаратуры не ведае перашкод ні ў прасторы, ні ў часе, яна зразумелая ўсім. Навука таксама звязвае людзей, але ў навуковым творы прадстаўлены толькі думкі, а ў мастацкім – думкі, ацэнкі, пачуцці.

**Эўрыстычная функцыя**. Мастацкая літаратура стымулюе творчы патэнцыял чалавека, развівае яго фантазію. Выяўленне і развіццё індывідуальных сіл асобы, яе творчых здольнасцяў – гэта адна з найважнейшых задач, якая стаіць перад педагогамі.

**Выхаваўчая функцыя**. Сёння першаснае значэнне набывае патрыятычнае або нацыянальнае выхаванне. «Нацыянальнае выхаванне – гэта мэтанакіраваны і паслядоўны працэс, у выніку якога выхаванцы авалодваюць аб'ектыўнымі звесткамі па гісторыі і культуры свайго народа, асэнсоўваюць агульнае паміж людзьмі і адметнае, што выяўляецца ў характары, паводзінах, дзейнасці прадстаўнікоў нацыі. Гэта аб'ектыўна неабходны працэс для паўнакроўнага выхавання Асобы і яе развіцця, для яднання Грамадства»[1]. Ролю мастацкай літаратуры ў гэтым працэсе цяжка пераацаніць. Успрымаючы веды, чалавек успрымае і ідэі, этычныя ідэалы, жыццёвыя ўстаноўкі. Сапраўдная літаратура заўсёды выхоўвае.

Акрамя таго, літаратура фарміруе эстэтычны густ, развівае ўменне бачыць і адчуваць прыгожае, робіць чалавека духоўна багатай асобай.

Такім чынам, літаратура з'яўляецца магутным сродкам уздзеяння на асобу. У большасці тэхнічных ВНУ не прадугледжваецца вывучэнне літаратуры, але і пакідаць яе па-за ўвагай, не выкарыстоўваць у працэсе навучання і выхавання студэнтаў, на наш погляд, будзе памылкай. Творы мастацкай літаратуры могуць з поспехам выкарыстоўвацца на занятках беларускай мовы. Сучасная методыка дае для гэтага самыя шырокія магчымасці.

Адной з асноўных мэт курса «Беларуская мова» з'яўляецца развіццё навыкаў вуснага маўлення. Студэнтам прапаноўваюцца тэмы вусных выказванняў, прычым тэма-

[1] Шавыркін М. Нацыянальнае касмапалітычнае і ўрокі мовы // Роднае слова. – 1994. – № 9.

тыка вельмі шырокая: гісторыя і этнаграфія беларусаў, іх нацыянальны характар, матэрыяльная і духоўная культура, асвета і навука, мастацтва і інш. Выкарыстанне мастацкіх твораў пры абмеркаванні вышэйназваных тэм дазволіць зрабіць працу на занятках больш эфектыўнай і цікавай для студэнтаў. Беларуская літаратура дае найбагацейшы, каштоўны матэрыял для гэтага. Прывядзём некалькі прыкладаў. Так, пры разглядзе тэмы «Нацыянальны характар і ментальнасць беларусаў» можна выкарыстаць нарыс У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» (глава «Людзі зямлі беларускай»), дзе пісьменнік разважае пра адметнасці беларускага характару. На аснове гэтага твора можна паставіць праблемныя пытанні, правесці дыскусію. Тэму «Беларуская міфалогія» ярка праілюструюць вершы М. Багдановіча з нізкі «У зачараваным царстве» (цыклы «Лясун», «Вадзянік», «Змяіны цар»). Вершаказы А. Разанава «Горад», «Вежа» зробяць больш яркім і цікавым абмеркаванне тэмы «Беларускае дойлідства» і г. д. Вядома, што творы сапраўдных майстроў слова робяць велізарны ўплыў на свядомасць чалавека, надоўга застаюцца ў памяці, таму відавочнай з'яўляецца важнасць выкарыстання іх на занятках.

Сучасная методыка выкладання беларускай мовы патрабуе, каб граматычныя заданні былі пабудаваныя на аснове тэкстаў. Правільны, граматны падбор тэкстаў дазваляе спалучыць эфектыўную працу па засваенні вучэбнага матэрыялу з выхаваннем. Тэксты павінны быць змястоўнымі і скіраванымі на развіццё нацыянальнай свядомасці студэнтаў. І тут мастацкая літаратура з'яўляецца незаменнай крыніцай для падбору тэкстаў і складання дыдактычных заданняў. Вельмі карысна падбіраць матэрыял такім чынам, каб ён быў звязаны з тэмай вуснага маўлення; гэта дазволіць лагічна і паслядоўна перайсці ад граматычных заданняў да вуснага абмеркавання той ці іншай тэмы, звязаць часткі заняткаў у адзінае цэлае.

Вышэй ужо адзначалася вялікая роля мастацкай літаратуры ў абуджэнні і развіцці творчага патэнцыялу асобы. Методыка сёння прапануе вельмі шырокі спектр разнастайных творчых прац на аснове літаратурных твораў: розныя віды пераказу, у тым ліку выбарачны і творчы; сачыненні-разважанні па пэўнай тэме ці праблеме з выкарыстаннем твораў аднаго ці некалькіх пісьменнікаў; сачыненні па пачатку (у якасці пачатку можа выступаць верш); напісанне водгуку ці рэцэнзіі на твор і інш. Такія працы маюць выключнае значэнне пры навучанні мове. Яны не толькі ўдасканальваюць моўныя навыкі студэнтаў і ўзбагачаюць іх слоўнікавы запас, але і развіваюць уменне разважаць, паслядоўна выказваць свае думкі, адстойваць свой погляд на тую ці іншую праблему.

Важным аспектам з'яўляецца і тое, што мова мастацкіх твораў выдатных беларускіх паэтаў і пісьменнікаў – гэта лепшы ўзор сапраўднай беларускай мовы, мовы багатай, вобразнай, мілагучнай, і яна, безумоўна, павінна гучаць на занятках.

Такім чынам, важнасць выкарыстання мастацкай літаратуры пры навучанні беларускай мове бясспрэчная.

## ЛІТАРАТУРА


1. Шавыркін М. Нацыянальнае касмапалітычнае і ўрокі мовы // Роднае слова. – 1994. – № 9. – С. 3–4.
2. Поспелов Г. Н. Теория литературы. – М.: Высшая школа, 1978.